або само ў труну лягло, або «*маць-сыра зямля растварылася, бела целечка схаранілася*» [3, с. 206]. Песні ўтрымліваюць эксплікацыю аплаквання рытуальнай ахвяры. Нягледзячы на сцвярджэнне, што па малайцу некаму плакаць, яны, як правіла, завяршаюцца апісаннем плачу маці, сястры, жонкі (часам у выглядзе птушак) над целам забітага стралой малойчыка. У «сілавым полі» рытуалу аплакванне — і рэальнасць, і метафара выкліканай нябеснай вады, якая нараджае рэкі, крыніцы, ручаі, калодзежы. Тут дарэчы нагадаць, што ў карагоднай песні «Стрылка» вада па сваёй станоўчай семантыцы супрацьпастаўляецца ўсім астатнім рэчывам — згубіцелям красы.

Такім чынам, можна зрабіць вывад, што абодва абрады — «Стрылка» і «Страла» — знаходзіліся ў семантычным полі аднаго міфа. Праз пазнейшы канцэпт храма і пучок звязаных з ім дзеянняў, вобразаў, матываў яны імпліцытна захоўвалі памяць аб страчаным звяне — рытуальным ахвярапрынашэнні, якое было цэнтральнай кропкай, інфармацыйным згусткам, каталізатарам разгортвання розных ліній абрадаў.


1. Барташэвіч Г. А. Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя. Мн., 1985.
2. Кавалёва Р. М. Песні абраду «Пахавання стралы» у сусветным міфалагічным кантэксце // Славянские литературы в контексте мировой. Материалы и тезисы докладов международной научной конференции. Минск, 25-30 октября 1993 г. Мн., 1994.
3. Новак В. С. Абраднасць і паэзія «пахавання стралы». Гомель, 2002.
4. Повесть временных лет. М.-Л., 1950



***А.Я. Камінскі (Мінск)***


## ТРАДЫЦЫЙНАЯ СВЯТОЧНАЯ КУЛЬТУРА УСХОДНЯГА ПАЛЕССЯ. ЛАКАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

Зімовы святочны перыяд – мнагаслойны, увабраўшы ў сябе абрады і звычаі, звязаныя з міфалагічнымі і рэлігійнымі ўяўленнямі, працэс фарміравання якіх адбываўся ў розныя гістарычныя эпохі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вызначальнае месца ў навагодні перыяд належала калядаванню і шчадраванню. Звычай калядавання, насычаны народным гумарам і актыўнай карнавалізацыяй, займаў галоўнае месца ў навагоднім рытуальна-абрадавым комплексе. У Мазырскім павеце калядаваць хадзілі з казой або зоркаю. Пры казе павінны былі быць скрыпка і бубен. У гульнёвым ассяроддзі калядных святкаванняў умоўна ажыццяўлялася драматычная пагранічная сітуацыя максімальнага яднання " гэтага " свету з " тым."[1, с. 70]. У матэрыялах этнографаў зафіксаваны імправізаваныя сцэнкі калядоўшчыкаў з уяўным пахаваннем і памінкамі нябожчыка, удзельнікамі якіх былі поп, дзяк, плакальшчыца. Часта тыя ж пераапранутыя разыгрывалі сцэны вяселля або сватання. Элементы маскавання дазвалялі актыўным вяскоўцам у калядны перыяд беспакаранна існаваць за нормамі дапусцімых паводзін у сваім сацыяльным асяроддзі.

На тэрыторыі Усходняга Палесся напярэдадні Новага года моладзь прыбірала Шчодру – прыгожую дзяўчыну апраналі ў святочнае адзенне, галаву ўпрыгожваў вянок з папяровых кветак і адпраўляліся па хатах вадзіць казу, спяваць песні. Аналіз этнаграфічных крыніц паказвае, што гульневыя моманты абрада "Шчадравання "былі насычаны гумарам і імкненнем далучыць да дзеі як мага больш глядачоў.

Заключнай часткай усіх калядных спектакляў было частаванне іх удзельнікаў. Гаспадары шчодра адорвалі ўдзельнікаў карнавальнага гурта. У Мазырскім павеце, напрыклад, за праспяваную песню гаспадары давалі па аднаму ці па два бліны на кожнага, ці па паляніцы ( маленькай булачцы з жытняй, грэцкай, ці пшаніцы). Часта абмен падарункамі адбываўся ў гульнёва – жартаўлівай форме [1, с. 73] .

Шматвякавы ідэалагічны ўплыў хрысціянства, сацыяльны прагрэс XX ст., калектыўнае вядзенне гаспадаркі ў саўгасах і калгасах сталі вызначальнымі для ператварэння навагодніх сакральных звычаяў у святочную забаву. Усе старыя песні, танцы, карагоды, гульні моладзі як найбольш свабодны ад рытуалу кампанент навагодняга свята служылі толькі адной мэце – унесці ў паўсядзённае жыццё вёскі весялосць і аптымізм. ." [2, с. 94] У нашыя дні народныя навагоднія звычаі найбольш захаваліся ў Гомельскай вобласці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Галоўнай ідэяй святаў веснавога цыкла была ідэя адраджэння і абнаўлення прыроды. Сяляне лічылі, чым раней прыйдзе на Зямлю вясна, тым хутчэй пачнецца сяўба, выган скаціны ў поле, таму на поўдні " клікаць вясну " выходзілі ў апошні дзень Масленіцы. Дзяўчаты падзяляліся на дзве-тры партыі і займалі ўзгоркі, вызваленыя з-пад снегу і там папераменна гукалі вясну.

У Лельчыцкім раёне гаспадыні выпякалі з цеста " конікаў " і частавалі іх кашай. Маладыя дзяўчаты ў гэты дзень усталёўвалі елку на ўзвышша, упрыгожвалі яе рознакаляровымі кветкамі з паперы і пачыналі гукаць вясну. Праз некаторы час да дзявоцкага гурта далучаліся маладыя хлопцы, пасля чаго пачыналася ігрышча, частаванне яйкамі і " конікамі".

Адным з самых распаўсюджаных звычаяў на Гомельшчыне быў магічна-аграрны ахоўна-засцерагальны абрад "Ваджэнне стралы", які праводзіўся на Ушэсце ( 40-ы дзень пасля Вялікадня). Аналіз фактычных матэрыялаў дазваляе зрабіць вывад, што для гэтага абрада былі характэрны: масавасць удзелу, эмацыянальны ўздым удзельнікаў, стыхійнае разгортванне абрадавага дзеянне, але тым не меньш строгая паслядоўнасць усіх рытуальных эпізодаў. У пластычным вырашэнні абрадавых дзей найбольш характэрнымі формамі з'яўляліся шэсці і карагоды.

Апошнім, завяршаючым звяном вясенняга каляндарна-абрадавага цыкла, было троіцка-сяміцкае свята, якое прыходзілася на канец вясны- пачатак лета, святкавалася на пяцідзесяты дзень пасля Вялікадня і ўтрымлівала шмат карнавальных элементаў.

У панядзелак русальнага тыдня адбываўся абрад "провадаў русалкі ". На ролю русалкі выбіралі прыгожую, тэмпераментную дзяўчыну, распраналі яе, на галаву адзявалі вялікі вянок з жывых кветак і вялі да жыта, дзе пачыналіся рытуальныя дзеі з гульнявымі элементамі.

У чацвер спраўлялі абрады выклікання дажджу, каб не было засухі летам. Маладыя людзі цешыліся, абліваючы адзін аднаго вадою, які ў народзе называўся – абліваха [3, с. 203]. А ў траецкую ноч моладзь запрашала музыкантаў у хату, дзе адбывалася ігрышча [3, с. 229-230].

Важнае месца ў сёмушнай абраднасці займаў матыў прадказанне лёсу. Дзяўчаты варажылі на вянках з кветак або



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бярозавых галінак пра будучае замужжа і пад час кумлення. Загадзя дзяўчаты выбіралі месца, дзе вакол дзвюх бярозак можна было б вадзіць карагоды. Шэсцем з песнямі дзяўчаты накіроўваліся ў лес, дзе потым аплятаті верхнія галіны дзвюх бяроз у выглядзе своеасаблівых варот – аркі, праз якія праходзілі дзяўчаты і абменьваліся падарункамі. Як лічыць даследчыца В.К. Сакалова, кумаўство наўрад ці было звязана з заключэннем шлюбаў і прыняццем у сувязі з гэтым у род жанчын. Гэта хутчэй за ўсе прыняцце ў род, прызнанне ім паўнапраўнымі членамі дзяўчат, якія дасягнулі шлюбнага ўзросту [4, с. 200].

Кульмінацыйным момантам летняга святочнага календара з'яўляюцца купальскія абрады і гульні. Трэба адзначыць, што ў вызначаным намі рэгіёне купальскае свята утрымлівала шмат лакальных асаблівасцей.

У Рэчыцкім раёне, напрыклад, рытуальнае застолле набывала тэатралізаваны характар. З элементамі вясельнага абраду, вянчаннем, святочным застоллем з песнямі, музыкай, скокамі праводзілася гульня “Марусінанка”. Такім чынам, усеагульная купальска-вясельная рытуальная вячэра стварала атмасферу святочнасці і весялосці [5, с. 53].

Найбольш паслядоўна традыцыя распальвання вогнішча існавала ў мястэчках, размешчаных паміж Прыпяццю і Дняпром. У якасці варыятыўнай традыцыі там фіксаваўся звычай паліць паходні і бегаць з імі па полі. Расклаўшы вогнішча, ў агонь з песнямі кідалі пудзіла, якое рабілі з саломы, падобнае на чалавека. Калі пудзіла згарыць, дзяўчаты і хлопцы пераскоквалі праз гэтае вогнішча [6, с. 103].

У асобных месцах Усходняга Палесся на Купалле працягваліся абрады кумлення і “провадаў русалкі” (Лоеўскі, Брагінскі, Нараўлянскі, Гомельскі раёны). Русалку моладзь “заганяла ” на грушу, дзе кожная з дзяўчат закідвала свой вянок на галінкі дрэва. Пасля варажбы русалка саскоквала і пужала ўсіх прысутных.

Мясцовыя звычаі і абрады праводзін русалкі з удзелам маскіраваных персанажаў больш поўна на тэрыторыі Беларусі да канца XX ст. захаваліся на тэрыторыі даследуемага намі рэгіёна. Сучасныя палявыя даследаванні, дзякуючы інфармацыі людзей старэйшага пакалення, дазваляюць зрабіць вывад аб частковым існаванні на сучасным этапе рэгіянальных і лакальных асаблівасцей

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

традыцыйнай святочнай культуры Усходняга Палесся [7, ф. 8, воп. 79, спр. 165, сш. 4, № 43, л. 77-78]. Дзякуючы комплекснаму даследаванню сучасных беларускіх святаў каляндарнага цыкла, які праводзіцца калектывам кафедры рэжысуры свят БДУ культуры, бачна, што сёння штогод святкуюцца ў палескіх вёсках толькі Каляды, Новы год, Масленіца, Дажынкі і Кірмаш. Амаль паўсюдна зніклі традыцыйныя абрадава – рытуальныя і гульнёвыя дзеі святаў Сёмухі і Юр'я, Багач.[8]

Такім чынам, вывучэнне рэгіянальных і лакальных асаблівасцей святочнай культуры Усходняга Палесся работнікамі культуры і іх выкарыстанне ў каляндарных святах на сучасным этапе, дазволіць адрадзіць і захаваць унікальныя з'явы ўсходнепалескай святочнай культуры.


1. Кухаронак Т.І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў. – Мн., 2001.
2. Гурскі А.І. Калядны цыкл \\ Каляндарна-абрадавая паэзія. – Мн., 2001
3. Романов Е.Р. " Белорусский сборник " Быт белоруса. Вильна. 1912. Вып. 8
4. Соколова В.К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов. – М., 1979
5. Гуд П.А. Беларускае купалле: кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей. – Мн., 1999
6. Радченко З. Гомельские народные песни. Записки ИРГО по отделению этнографии. Т.XIII. Вып.II. СПб., 1888
7. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі ( АІМЭФ).
8. Архіў кафедры рэжысуры свят.


***А.В. Кучарава (Гомель)***

## СУЧАСНЫЯ ДЗІЦЯЧЫЯ "ВЫКЛІКАННІ" І ІХ АДМЕТНАСЦІ

Напэўна, можна пагадзіцца са словамі Г.А. Барташэвіч аб тым, што дзіцячы фальклор з'яўляецца "адным з найменш вывучаных" раздзелаў народнай творчасці [1, с. 3]. У найбольшай ступені вышэй акрэсленае датычыцца ўласна дзіцячай славеснай творчасці, якая, захоўваючы адносную даступнасць і вялікі міфагенны патэнцыял, характарызуецца значнай сацыяльнай і псіхалагічнай адасобленасцю ад культуры дарослых. Разам з тым сучасныя даследчыкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ